# КРАЯЗНАЎСТВА ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ І ВЫХАВАННЯ ЛЮБОВІ ДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ

***Рыбакова І.А.,*** *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія №71 г.Гомеля"*

***Зелянкоўская Ірына Сяргеўна,*** *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія №71 г.Гомеля"*

У Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і моладзі ў Рэспубліцы Беларусь адным з асноўных напрамкаў выхавання вызначана фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму асобы. У аснове гэтага працэсу ляжаць засваенне агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, культурных і духоўных традыцый беларускага народа, фарміраванне гатоўнасці да выхавання грамадзянскага абавязку.

Важнейшым сродкам далучэння школьнікаў да грамадзянскай культуры з'яўляецца краязнаўчая дзейнасць. Школьнае краязнаўства – гэта педагагічны працэс арганізацыі дзейнасці навучэнцаў, які звязаны з вывучэннем імі роднага краю і выкарыстаннем атрыманых ведаў на практыцы. У працэсе краязнаўчай дзейнасці ў школьнікаў назапашваецца вопыт узаемадзеяння з прыродным і сацыяльным навакольным асяроддзем. Пад «краязнаўчай дзейнасцю» вучняў разумеецца не толькі пошукавая, але і любая дзейнасць пры ўмове асэнсавання яе сувязі з пазнаннем, зберажэннем і забеспячэннем развіцця свайго краю.

Краязнаўчая праца ў школе развіваецца ў двух цесна звязаных паміж сабою кірунках: на ўроку і ў пазаўрочны час. Краязнаўчыя інтарэсы вучняў, фарміруючыся падчас вывучэння мовы і літаратуры ў класе, знаходзяць далейшае развіццё ў працэсе пазакласных і пазашкольных краязнаўчых заняткаў. Зближэнне гэтых двух напрамкаў забяспечвае стварэнне пэўнай сістэмы, якая ўплывае на фарміраванне ў навучэнцаў ведаў аб родным краі, на выхаванне нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму як вызначаючых якасцей асобы, на развіццё пошукавых уменняў і абуджэнне ў навучэнцаў імкнення да самаўдасканалення.

Як далучыць вучняў да краязнаўчай дзейнасці і зрабіць гэты працэс цікавым, змястоўным і карысным? Як стварыць аптымальныя ўмовы для фарміравання трывалых ведаў пра свой край? Якія формы арганізацыі краязнаўчай працы больш эфектыўныя?

Поспех кразнаўчай працы ў многім залежыць ад настаўніка, які сам павінен быць краязнаўцам і добра ведаць метадалагічныя асновы школьнага краязнаўства, літаратуру па гэтай тэме, непасрэдна ўдзельнічаць у вывучэнні свайго краю і спрыяць пошукава-даследчай дзейнасці вучняў, умець

устанаўліваць цесную ўзаемасувязь вучэбнай і пазакласнай, пазашкольнай працы, каб вучні маглі адчуць практычную значнасць атрыманых ведаў.

Калі казаць аб асабістым вопыце, то варта адзначыць, што спачатку краязнаўчая праца ў нашай педагагічнай практыцы пачалася з удзелу ў эксперыментальнай пляцоўцы “Мадэль выхаваўчай работы з вучнямі з улікам рэгіянальных асаблівасцей”, якая дзейнічала на працягу 5 гадоў у гімназіі.

Асноўнай мэтай пляцоўкі па выкарыстанню рэгіянальнага кампанента з’яўлялася фарміраванне высокай нацыянальнай свядомасці праз вывучэнне і далучэнне да нацыянальных традыцый і культуры роднага краю; аказанне дапамогі ў асэнсаванні вучнямі духоўных багаццяў свайго народа.

Курс быў накіраваны на практычную самастойную дзейнасць вучняў, у цэнтры ўвагі якой – вывучэнне канкрэтных матэрыялаў па гісторыі, культуры рэгёна.

Праграма заснавана на краязнаўчай дзейнасці ў 4 напрамках:

1. “Адчыні таямніцу часу”.
2. “Шляхамі паэтаў і герояў”.
3. “Сувязь часоў”.
4. “Пошук: нашы знаходкі”.

Значнае месца ў ёй займала дзейнасць гуртка “Гомелезнаўства”.

Асноўныя напрамкі работы гуртка:

1) вывучэнне гісторыі роднага краю;
2) вывучэнне культуры роднага краю;
3) вывучэнне традыцый роднага краю;
4) экскурсіі па памятных мясцінах;
5) сустрэчы са знакамітымі людзьмі.

За час дзейнасці гуртка быў сабраны, абагульнены і прадстаўлены на розных узроўнях, адпаведна і распаўсюджаны самы разнастайны матэрыял. Уся праведзеная з навучэнцамі краязнаўчая праца мела высокія паказчыкі эфектыўнасці ў вучэбна-выхаваўчым працэсе і выніковасці на розных конкурсах.

Пры арганізацыі краязнаўчай працы з дзецьмі выкарыстоўваюцца розныя формы і метады работы: лекцыі, падрыхтоўка рэфератаў, складанне радаводаў, падбор фотаматэрыялаў і ілюстрацый , запіс успамінаў, работа ў архівах, бібліятэках, прэзентацыі, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, прадстаўнікамі розных прафесій, экскурсіі. Адзін з самых перспектыўных і ўдалых, на мой погляд, кірункаў — гэта арганізацыя пошукавай краязнаўчай дзейнасці.

Асноўныя этапы работы ў арганізацыі *пошукавай краязнаўчай дзейнасці*.

1 этап - выбар аб'екта вывучэння.

2 этап – вывучэнне літаратуры і іншых крыніц (інтэрнэт, гутаркі з удзельнікамі падзей і інш.)

3 этап – абагульненне матэрыялу і падрыхтоўка яго да прадстаўлення.

4 этап – прадстаўленне ў выглядзе прэзентацый, пазнаваўчых гульняў, віктарын, конкурсаў.

5 этап- падвядзенне вынікаў.

Такім чынам, былі вывучаны і прадстаўлены матэрыялы па такіх тэмах: пазнаваўчая гульня “Гомель сёння і ўчора”, віртуальная экскурсія “Помнікі горада Гомеля”, пошук “Гісторыя майго роду ў гісторыі майго горада” і інш.

Гурткоўцы з захапленнем рыхтуюць матэрыялы і выступаюць з імі перад слухачамі, тым самым прапагандуючы свае веды. Паступова школьнікі самі пачынаюць далучацца да пошукавай працы: збіраюць краязнаўчы матэрыял, выкарыстоўваюць яго на ўроках беларускай мовы і літаратуры, у пазакласных занятках, пішуць вершы і творы аб сваім горадзе, выступаюць з сабраным і пераапрацаваным матэрыялам на навуковых канферэнцыях, афармляюць стэнды, пішуць нататкі ў “Гімназічны веснік”.

Важным сродкам назапашвання духоўных багаццяў і развіцця эстэтычнага ўспрымання і творчай актыўнасці вучняў з’уляецца *экскурсія*, як па адносна недалёкіх мясцінах, так і па розных рэгіёнах краіны. Сустрэча з сапраўднымі гістарычнымі каштоўнасцямі пакідае глыбокі след у душы дзяцей і надоўга застаецца ў памяці.

*Этапы падрыхтоўкі да экскурсіі.* Спачатку вучні атрымоўваюць заданне: у розных крыніцах знайсці матэрыял па тэме, апрацаваць яго, падрыхтаваць выступленні ў час экскурсіі. Група вучняў робіць фотаздымкі, з якіх можна пазней аформіць фотаальбомы і выкарыстаць іх падчас урокаў, літаратурных вечарын і сустрэч. Каб экскурсія атрымалася завершанай, патрэбна абавязкова падвесці вынікі. Можна правесці абагульняючую гутарку, выставу творчых работ у форме пісьмовай замалеўкі, нарыса, сачынення-ўспаміну, верша, каб перадаць свае ўражанні ад вандроўкі.

За апошнія гады з гурткоўцамі наведалі Нясвіж, Мір, Лінію Сталіна. У кастрычніку адбылася экскурсія ў г. Добруш на парцалянавую фабрыку і п. Карма ў Кармянскі манастыр. Перад паездкай гурткоўцы вывучалі матэрыял па гісторыі і славутасцях г. Добруша, на занятках гуртка пазнаёміліся з жыццяпісам Святога Іаана Кармянскага, паглядзелі дакументальны фільм, падрыхтавалі выступленні перад удзельнікамі экскурсіі. Пасля экскурсіі падзяліліся ўражаннямі, прадставілі фотаматэрыял і справаздачу па паездцы.

З гурткоўцам  працавалі над праектам “Залатое кальцо” Гомельшчыны”, у рамках якога ажыццявілі паездкі ў Рэчыцу, Тураў, Ветку і Добруш. Кожная паездка была цікавай і запамінальнай.

Цікавай і важнай формай краязнаўчай працы з'яўляюцца *сустрэчы са знакамітымі людзьмі роднага горада.* На асобныя заняткі пажадана запрашаць навукоўцаў, супрацоўнікаў музеяў, пісьменнікаў, музыкантаў, спецыялістаў той ці іншай галіны. Для гурткоўцаў такой запамінальнай стала сустрэча з гомельскай паэткай Нінай Шкляравай, гомельскай спявачкай Вольгай Цярэшчанка, былым дырэктам гомельскага краязнаўчага музея, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Магчымасці для выкарыстання краязнаўчага матэрыялу вельмі вялікія і нават нечаканыя.Так, на творчай сустрэчы Ніна Шклярава прэзентавала сваю новую кнігу, у якой быў змешчаны пераклад паэмы Мікалая Мельнікава “Рускі крыж” на беларускую мову. Удзельніца гуртка, уражаная асобай пісьменніцы, глыбей пачала знаёміцца з яе творчасцю, асабіста сустракалася з паэтэсай, а вынікам знаёмства стала даследчая работа “Тэма духоўнага адраджэння

грамадства ў паэме Мікалая Мельнікава “Рускі крыж”. І такіх прыкладаў можна прывесці шмат.

Канчатковым вынікам сур’ёзнай краязнаўчай працы нашых гурткоўцаў з’яўляецца навуковая-даследчая дзейнасць і ўдзел у конкурсах.

Галоўная мэта ўдзелу ў конкурсах: развіцце ў навучэнцаў цікавасці да прадмета, да культурнай і гістарычнай спадчыны рэгіёна. Падрыхтоўка да конкурсаў і ўдзел у іх спрыяе развіццю ведаў навучэнцаў, творчых здольнасцей.

Кожны год у нашым горадзе праходзяць мерапрыемствы ў рамках Пасхальнага тыдня. Разам з гурткоўцамі мы былі на праглядзе мастацкай стужкі “Поп”. Пасля прагляду было абмеркаванне, і ў вучняў узніклі пытанні па праблемах, узнятых у фільме. Адно з іх: Якая роля праваслаўнай царквы ў гады Вялікай Айчыннай вайны? Пачалі знаеміцца з літаратурай, вывучаць матэрыялы. А вынікам стала творчая работа “ Свет душы” пра подзвіг беларускага духавенства ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З гэтай работай гурткоўцы ўдзельнічалі ў конкурсе Гомельскай Епархіі і атрымалі спецыяльны прыз.

Тэматыка даследчых работ па беларускай мове і літаратуры за апошнія гады:

- “Ірына Паскевіч – апошняя гомельская княгіня”;
- Мой хлеб надзённы” (маральнае стаўленне да хлеба: ад этнакультурных традыцый беларусаў да паўсядзённага жыцця);
- “Званы Беларусі”;
- “Русалка – рамантычны вобраз беларускага фальклору”;
- “Тэма духоўнага адраджэння грамадства ў паэме М. Мельнікава “Рускі крыж”;
- “Мая знакамітая зямлячка” (серыя даследчых работ па творчасці паэтэсы Ніны Шкляравай);
- “Маладыя галасы Гомельшчыны” (юнацкая паэзія Марыі Маліноўскай).

У апошні час прыкметна ўзмацнілася цікавасць да праблемы павышэння эфектыўнасці ўрока. Вялікая частка метадыстаў і настаўнікаў сваю ўвагу засяроджваюць на пошуках новых дасканалых формаў арганізацыі заняткаў, структуры ўрока, на ўдасканаленні методыкі навучання, на спосабах актывізацыі навучальнай дзейнасці. У наш час, калі грамадства ўсвядоміла неабходнасць асэнсаваць свае вытокі, вярнуцца да нацыянальных традыцый, урокі мовы і літаратуры не могуць поўнасцю задаволіць патрэбу ў спасціжэнні роднага слова, культуры. Таму, на маю думку, настаўніку-філолагу вельмі важна абапірацца на краязнаўчы матэрыял, на сувязь беларускай мовы і літаратуры з гісторыяй, культурай роднага краю.

На ўроках беларускай мовы мы выкарыстоўваем гісторыка-геаграфічныя звесткі, якія дазваляюць не проста зацікавіць дзяцей унікальнымі фактамі, але ствараюць развіваючую прастору для вучняў, якая абуджае ў іх цікавасць да творчасці і дазваляе рашыць асноўную задачу ўрока: развіцце асобы праз слова і творчасць.

Напрыклад, пры вывучэнні назоўнікаў агульных і ўласных вучні атрымоўваюць заданне суаднесці назвы гарадоў і рэк Гомельшчыны і скласці з імі сказы.

Дняпро Мазыр

Сож Рэчыца

Прыпяць Гомель

Пры вывучэнні антонімаў у раздзеле “Лексіка” прапануем вучням напісаць сачыненне-мініяцюру на тэму “Мой горад сёння і ўчора”. Пры вывучэнні лічэбнікаў вучні падбіраюць дома матэрыял і складаюць сказы з лічэбнікамі, якія характарызуюць горад, вобласць. Пры вывучэнні функцыянальных стыляў мовы вучні складаюць тэксты розных стыляў. Напрыклад, на тэму “Горад Гомель” – навуковага, мастацкага і публіцыстычнага стыляў.

Асобна трэба сказаць пра тэмы сачыненняў, якія можна прапанаваць вучням: “Мой горад”, “Мая вуліца”, “Мой раён”, “За што я люблю свой горад”.

Асаблівае месца ў вывучэнні літаратурных твораў належыць звароту да трагічных і гераічных старонак барацьбы нашых суайчыннікаў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Можна расказаць пра трагічны лес дзяцей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны і мемарыяльны комплекс “Чырвоны бераг” у Жлобінскім раене пры вывучэнні апавядання Я.Брыля “Васількі”; на ўроку беларускай літаратуры ў10 класе па тэме “Memento mori”, альбо “У чым сэнс жыцця чалавека?” вучням даць апераджальнае заданне “Гісторыя спаленых вёсак Гомельшчыны”; пры вывучэнні аповесці І.Шамякіна “ Гандлярка і паэт” расказаць пра дзейнасць гомельскага падпольшчыка Івана Шылава.

Пачынаючы з 6 класа, вучні далучаюцца да праектнай дзейнасці. На ўроку беларускай літаратуры ў 6 класе з выкарыстаннем тэхналогіі праектнага навучання быў праведзены ўрок па тэме “Экалагічная тэма ў вершы П.Панчанкі “Сармацкае кадзіла”.

Далучыцца да культурнай спадчыны дазваляе ўрок-экскурсія . Пры падрыхтоўцы да ўрока развіцця мовы на тэму «Сачыненне-апісанне мясцовасці» ў 7 класе быў выкарыстаны краязнаўчы матэрыял. Сачыненне насіла назву «Ля помніка Ірыне Паскевіч”. Праца праходзіла ў некалькі этапаў. На першым этапе вучні атрымлівалі індывідуальныя заданні: знайсці звесткі пра азначаны аб'ект. У працэсе працы фарміраваліся навыкі даследчай дзейнасці. Затым (другі этап) у час урока-экскурсіі кожны вучань выступаў у ролі экскурсавода, выкладаючы сабраны матэрыял (выкарыстоўваючы сабраныя звесткі, вусна апісваючы свой аб'ект). Пасля гэтага (трэці этап) вучні пісалі сачыненне пра славутасці горада, іншымі словамі, адбываўся працэс асэнсавання і абагульнення атрыманай інфармацыі, выпрацоўка ўласнай думкі па вывучаным матэрыяле. Такія ўрокі фарміруюць навыкі творчага мыслення, пашыраюць пазнавальную актыўнасць, далучаюць да каштоўнасцяў грамадства, выхоўваюць патрыятычныя пачуцці .

Такім чынам, прадуманая арганізацыя краязнаўчай працы на ўроках і ў пазаўрочны час дазваляе павысіць матывацыю навучання беларускай мове і літаратуры і абудзіць любоў да сваёй радзімы.

Крытэрыямі і спосабамі адзнакі эфектыўнасці краязнаўчай працы, стабільнасці дасягнутых вынікаў з'уляюцца:

1. Павышэнне пазнавальнай цікавасці да вывучэння роднага краю;
2. Актыўны ўдзел навучэнцаў у:

а) сустрэчах;

б) экскурсіях, пошукавых мерапрыемствах;

д) пазакласных мерапрыемствах;

е) стварэнні краязнаўчых мультымедыйных прэзентацый і відэаролікаў;

ж) markdown

3. Фарміраванне патрыятычных пачуццяў.

Фактары рызыкі – нізкая матывацыя навучэнцаў.

Краязнаўства стала нашым лёсам. Ці ёсць сэнс у гэтай справе? Выхаванне патрыятызму, нацыянальнай свядомасці – справа складаная, асабліва ў цяперашніх умовах. Жыццё адкажа на гэтае пытанне. Чацвёра вучняў-краязнаўцаў выбралі прафесію, звязаную з гісторыяй, музейнай справай, народнай культурай, журналістыкай. Гэта трошкі апраўдвае нашу працу і дае сілы для яе на будучыню.

Спіс літаратуры

1. Детский туризм и краеведение в Беларуси: пособие для учителей / авт. -сост. С. С. Митрахович [и др.]. Минск: Рифтур, 2003. – 104 с.

2. Краеведение: пособие для учителя; / под ред. А. В. Даринского. – М.: Просвещение, 1987. – 158 с.

3. Пазакласная праца па беларускай мове і літаратуры. М. А. Мяжэвіч, – Мінск: Аверсэв, 2007. – 351с.

4. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Н. В. Жуковіч, – Мінск: Аверсэв, 2007. – 157с.